*Наталля Дожына*

## НОТАГРАФІЧНЫЯ ВЫДАННІ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ У БЕЛАРУСІ У 1980-2000-Я ГГ.

Збіральніцтва і аналітычны агляд беларускіх народных песень, з савецкіх часоў па сённяшні дзень застаецца прэрагатывай навуковага і навукова-вучэбнага асяроддзя. Штогод фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя куткі Беларусі праводзяцца супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, групамі студэнтаў і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў – БДУКМ, БДПУ імя М.Танка, БДУ, БДАМ і інш. Калі у 70-90-я гады песні запісвалі на магнітафонныя (спачатку бабінныя, потым – касетныя) стужкі, то з XXI стагоддзя – на дыскі, электронныя носьбіты. Справа запісу песень – цяжкая і клапатлівая, але не менш складанай з'яўляецца і іх навуковая апрацоўка. Звычайна яна будуецца па наступных этапах: 1)расшыфроўка, ці пераклад песень на ноты з тэкстам; 2)жанравая атрыбуцыя і сістэматызацыя песень па пэўнай пракмеце; 3)навуковае асэнсаванне песень – аналіз іх вобразна-семантычнага, стылістычнага ўзроўняў – і, як вынік, напісанне навуковых артыкулаў; 4)выданне збораў песень ці асобных песень з навуковымі ці кароткімі інфармацыйнымі каментарыямі або без іх.

Ідэальная справа, калі работа з песнямі праходзіць праз усе адзначаныя этапы і завяршаецца выданнем збораў, якімі карыстаюцца многія пакаленні аматараў народнага спеву, але, зразумела, што далёка не заўсёды гэты шлях дасягае свайго лагічнага выніку.

Тым не менш за апошнія дзесяцігоддзі памежжа XX стагоддзяў у Беларусі і нават па-за яе межамі выдавалася і выдаецца шматлікая колькасць нотаграфічных збораў беларускіх народных песень. Дадзены артыкул – спроба зрабіць кароткі агляд усіх даступных на сённяшні момант беларускіх выданняў, якія адлюстроўваюць напрамкі ў справе папулярызацыі беларускай народнай песні.

Найбольш багатай часткай айчынных выданняў з'яўляюцца *рэпертуарныя зборнікі і метадычныя дапаможнікі*, якія выдаваліся ў вядучых вышэйшых установах адукацыі і культуры Беларусі, а таксама дзяржаўнымі і прыватнымі беларускімі выдавецтвамі «Навука і тэхніка», «Беларусь», «Тэхналогія», «Беларускія веды», «Чатыры чвэрці» і інш. [1, 2, 3, 4]. Гэтыя выданні прызначаліся не толькі для вучэбнай мэты – па іх спявалі і прафесійныя, і аматарскія самадзейныя калектывы беларускіх гарадоў і вёсак, дамоў культуры і сельскіх клубаў. Звычайна ў іх склад уваходзяць кароткая інфармацыйная даведка і метадычныя парады, напрыклад, для якога выканальніцкага складу прызначаюцца прыведзеныя ў зборы песні.

Важкую долю апублікаваных песеннікаў прадстаўляюць *зборы, складзеныя і апрацаваныя адным ці некалькімі беларускімі навукоўцамі-этнамузыколагамі.* Да іх ліку належаць, напрыклад, Т.Б. Варфаламеева («Песні Беларускага Панямоння» - Мн., 98), З. Я. Мажэйка («Песні Беларускага Паазер'я» - Мн., 81); З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева («Песні Беларускага Падняпроўя»- Мн., 99), у якіх, як бачым, сабраныя песенныя мелодыі асноўных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Уступныя артыкулы да гэтых збораў носяць паглыблены навукова-даследчы характер: выкладаюцца класіфікацыі груп песень па каляндарна-абрадавым, сямейна-родавым цыклах, рэгіянальных прыкметах з тыповымі для іх мелодыка-рытмічнымі формульнымі напевамі, сюжэтнымі і формаўтваральнымі асаблівасцямі. Цікава адзначыць, што зборнікі такога кшталту выходзілі не толькі з беларускіх выдавецтваў, але і ў суседніх краінах – Расіі, Украіне. Прывядзем, напрыклад, зборы З. Я. Можейко («Песни Белорусского Полесья» – М.,83) і З. В. Эвальд («Песни Белорусского Полесья» - М., 79), якія выйшлі ў маскоўскай друкарні ўсесаюзнага ўзроўню «Советский композитор».

Грунтоўныя выданні беларускіх народных песень, якімі няспынна карыстаюцца з савецкіх часоў і па сённяшні дзень амаль усе без выключэння фалькларысты, – гэта *зборы песень з многатомнай серыі «Беларуская народная творчасць»*, выдадзеныя ў 70-90-я гады вядучымі спецыялістамі і навукоўцамі ІМЭФ НАН Беларусі. У іх найбольш поўна і сістэматызавана прадстаўлены, як адзначаюць аўтары-укладальнікі, напевы лепшых узораў беларускіх народных песень з усіх музычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Асобную групу збораў песень прадстаўляюць кнігі, у якіх песні аб'ядноўваюцца па жанрава-абрадавай (жаніцьба Цярэшкі, радзіны, пахаванні, памінкі, галашэнні, вяселле, восеньскія і талочныя песні, валачобныя песні [5]), рэгіянальнай (песні мінскай вобласці, Палескае вяселле, песні Лагойшчыны [6]) спецыфіцы ці з'яўляюцца аўтарскімі зборамі [7].

Наступны напрамак нотаграфічных выданняў – *зборы папулярных народных песень, прыпевак* [8], у тым ліку для дзяцей, самадзейных гуртоў. Гэтыя зборы не заўсёды забяспечаны каментарыямі і носяць хучэй аматарска-асветніцкі характар. Вельмі часта яны маюць агульную збіральную назву па першым словам адной з уваходзячых у склад збора песень, напрыклад, «Крынічка», ці «Купалінка», «Родны край». Трэба адзначыць, што добрай традыцыяй яшчэ з савецкіх часоў было выданне народных песень ў *масавых перыядычных часопісах, газетах*, якія праходзілі праз лёс мноства чытачоў, што звярталіся ў рэдакцыі з пажаданнем апублікаваць ту ці іншую ўлюблёную папулярную беларускую песню на старонках абласной, раённай перыёдыкі - «Голас радзімы», «Сельская газета», «Беларусь», «Бярозка», «Звязда» і шмат іншых [9]. На жаль, у сённяшнім тэхналагічным свеце гэтая традыцыя ўтрачвае паступова сваю моц. На яе месца прыходзяць новыя інфармацыйныя тэхналогіі, і тым не менш, хочацца спадзявацца і верыць, што народная песня як рэч нематэрыяльнага, а духоўнага свету, нібыта жывая душа чалавека, застанецца ў часе і прасторы, у памяці далейшых пакаленняў спевакоў і аматараў беларускай песеннай культуры, дзякуючы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым ліку
і шматлікім нотаграфічным зборам, якія, безумоўна будуць выходзіць з беларускага друку ў далейшым.

**Спіс літаратуры:**

1. Беларускі абрад і сучаснасць: рэперт. зб. абрад. песень (для хору, вак. анс. ў супр. нар. інструм. і без) / уклад. і аўт. уст. сл. С.І. Дробыш. – Мінск : Беларускія веды, 1989. – 154 с.
2. Беларускія абрадавыя песні : метад. дап. (для спеваў без супр.) / Запіс. У. Раговіча. – Мінск : Беларускія веды, 1985. – 154 с.
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В.Дз. Літвінка; уклад. муз. часткі Г.Р. Кутырова. – Мінск, 1995.
4. Беларускія народныя песні: рэп. зб. (для спеваў-сола з літ.-лічб. суправ.) / уклад. В. Грабчук. – Мінск : Беларускія веды, 1985.
5. Беларускія народныя танцавальныя песні: рэп. зб. (для спеваў з ансамблем нар. інстр.) / аўт. апрац. А.В. Рашчынскі ; уклад. М.А. Козенка. – Мінск : Беларускія веды, 1988.
6. Валачобныя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей ; склад. муз. часткі В.І. Ялатаў. – Мінск, 1980.
7. Жаніцьба Цярэшкі / рэд. А.С. Фядосік ; уклад. тэкстаў, уступ арт. і камент. Л.М. Салавей ; уклад., сіст. і расшыфр. муз. мат-лу, уст. арт і камент. І.Дз. Назінай. – Мінск, 1993.
8. Радзіны: Абрад. Песні / уклад. тэкстаў Г.А. Пятроўскай ; апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак ; уступ. арт. і камент. Г.В. Таўлай. – Мінск, 1998.
9. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / уклад.тэкстаў, уступ. арт и камент. У.А. Васілевіча ; арт, сіст. і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск, 1986.
10. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В.Дз. Літвінка ; уклад. муз. часткі Г.Р. Кутырова. – Мінск, 1995.
11. Палесскае вяселле : зб. песень / уклад. и рэд. В.А. Захарава. – Мінск : Университэцкае выд-ва, 1984.
12. Песні Лагойшчыны: зборнік твораў традыцыйнай песеннай культуры / уклад. В. Несцяровіч ; уклад. муз. часткі І. Сіневіч. – Мінск : ТАА «Мэджык Бук», 2004.
13. Равенскі, М. Збор твораў : беларускія народныя песні / М. Равенскі / рэд. В. Скарабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 2008.
14. Прыпеўкі / рэдкал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989.
15. Музычная літаратура Беларусі 1970-1990. Нотаграфічны паказальнік / склад. Л.А. Цітова. – Мінск : Нацыянальная кніжная палата Беларусі, 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ